мир человека и способное выработать единую парадигму решения наиболее фундаментальных задач: определить закономерности паритетного сосуществования научно-технического прогресса и гуманитарно-экологических ценностей, выработать новые этические регулятивы взаимоотношений человека с природой, и т. д.

Чернобыльская ситуация инициирует государственную и исследовательскую практику и в Республике Беларуси: так, национальная стратегия устойчивого развития приоритетной объявляет экологическую политику, которая конституирует принцип "активной профилактики" в статусе экологического императива. Контекстно экологическая политика предполагает включить такой императив в структурно-инвестиционную политику, повысить уровень экологического образования и воспитания населения и целый ряд других задач. На этом пути не менее значимыми являются разработки методических рекомендаций по реальной оптимизации коэволюции общества и природы, и др.

*І. М. Браім*
**БДЭУ**

# ДА МЕТАДАЛОГІІ ДАСЛЕДАВАННЯ МЕНТАЛІТЭТУ

У апошнім дзесяцігоддзі XX ст. у беларускім грамадазнаўстве выразна праявілася цікаўнасць да менталітэту беларускага этнасу. Яе актывізацыя была звязана з асэнсаваннем працэсаў суверэнізацыі Беларусі з нагоды атрымання ею палітычнай незалежнасці. Да дасладавання менталітэту як асобнага феномену, так і ў сувязі з нацыянальным характарам і нацыянальнай ідэнтыфікацыі беларусаў прыбягалі прадстаўнікі розных грамадазнаўчых дысцыплін: гісторыкі, сацыелагі, этнапсіхолагі, палітолагі і інш.

Безумоўна, найбольш рэпрэзентатыўнымі і выніковымі з'яўляюцца міждысцыплінарныя даследаванні менталітэту сучасных соцыумаў псіхаланічыя, псіхалгічныя, палітыка і інш. З выкарыстаннем колькасных метадаў вымярэння ментальных адзнак. Разаааaам з гэтым трэба адзнаааачыць, што і гэтыя найбольш эфектыўныя метады збору і аналізу інфармацыі не могуць поўнасцю адэкватна вызнчаць хараактэрнасць для супольнасцей тых ці іншых мянтальных рыс. Пры гэтым можа праяўляцца нарцыцізм рэспанэнтаў і іх перавышаная самаацэнка (В.В. Кірыенка, 1999). Да гэтаг ддадзім рознае тлумачэнне паняццяў, што ўжываюцца ў анкетных апытаннях, ідэялагічныя, наацыянальныя, палітычныя прыхільнасці апытаных і суб'ектыўнасць даследчыкаў.

Значна цяжэй і рызыкоўней з пазіцыі навуковасці і адэкватнасці ментальных хараактаарыстых уяўляюць даследаванні традыцыйных сфарміраваных за доўгі гістарычны перыяд ментальных рыс, асабліва тых, што дайшлі да нас са старажытных часоў. Важнейшай крыніцай для гістарычных даследаванняў этнічнагаа менталітэту з'яўляецца так званая фальклорная культура. У гэтай культуры , якую складаюць міфы, быліны, казкі, прымаўкі, прыказкі, паданні і іншыя жанры народнай творчасці, у эмацыянальнай форме праяўляецца калектыўнае свядомае і бессвядомае. Значную этнапсіхалагічную інфармацыю нясуць традыцыйныя абрады і вераванні, звычаі і табу. Пэўную каштоўнасць маюць дарожныя нататкі падарожнікаў, апублікаваныя даследаванні гісторыкаў; этнографаў, фалькларыстаў мінулых стагоддзяў. Інфармацыю можна атрымаць з пісьмовых і літаратурных помнікаў. Безумоўна да гэтых крыніц трэба адносіцца з пэўнай крытычнасцю і асцярожнасцю, так як часам у іх праяўляецца суб'ектыўнасць, эмоцыі, памылковыя стэрэатыпы, палітычная і ідэалагічная ангажыраванасць. Таму любое даследаванне менталітэту патрабуе асаблівай карэктнасці і тактоўнасуі. Некарэктнасць заўвагі адносна ментальнасці іншых народаў можа выклікаць нацыянальныя крыўды і нават стварыць канфліктную сітуацыю.

Думаецца, што ў метадалагічным , палітычным і этычным падыходах да асвятлення этычнага менталітэту неабходна прыймаць да ўвагу наступнае:

1. Параўкальныя характарыстыкі светаўспрыймання і паводзін павінны абапірацца на базу разнастайных крыніц. Асаблівую каштоўнасць маюць колькасныя замеры праяўлення тых ці іншых ментальных адзнак. Пры адсутнасці матэрыялаў сацыялагічнага характару мэтазгодна ў першую чаргу выкарыстоўваць дадзеныя ім ацэнкі даследчыкаў, прадстаўнікоў тых супольнасцей, з якімі здзейсніваюцца параўнанні.

2. Характарыстыка ментальнасці таго ці іншага соцыуму не абавязкова павінна прадугледжваць параўнанні з іншымі соцыумамі. Яе можна рабіць і без параўнальнага аналізу.

3. Мецъ на ўвазе, ўто ў менталіцеце этнасу есць пазітыўныя і негатыўныя рысы. Праяўляюцца яны толькі па-рознаму.

4. Прызнаваць пэўную ўмоўнасць вынікаў даследавання, маючы на ўвазе, што ва ўсялякай супольнасці есць людзі з розным светаўспрыйманнем і розуманастроем. Тым больш, што погляды людзей і іх паводзіны ў пэўных умовах выяўляюцца неадназначна і могуць набываць нават ірацыянальны характар.